УДК 27:211.5«16/17»

# ЗАРАДЖЭННЕ КРЫТЫКІ ХРЫСЦІЯНСТВА Ў ЭПОХУ АСВЕТНІЦТВА

**Клімуць Лада Яраславаўна**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (г. Магілёў, Беларусь)

*Критика христианской церкви в эпоху Просвещения тесно связана с политикой государств, стремившихся к религиозному единообразию. Зарождению критического осмысления религиозных вопросов способствовали научные открытия и бурное развитие книгопечатания.*

Пасля 1660 г. у Еўропе пашыраецца крытыка хрысціянства. Цэлы шэраг абставін выклікаў гэтую крытыку сярод тых, хто адчуваў страх ці падвяргаўся праследаванням. Акрамя таго, у 1680-х гг. абсалютысцкая палітыка Францыі і палітыка Вялікабрытаніі пагражалі стабільнасці Паўночнай і Заходняй Еўропы і рэлігійнай незалежнасці пратэстантаў у Англіі, Ірландыі, Нідэрландах, нямецкіх дзяржавах.

У 1685 г. Людовік XIV адмяніў Нанцкі эдыкт і аб'явіў пратэстантызм незаконным у Францыі. Таксама ён адкрыта выказаў жаданне захапіць землі, якія належалі Нідэрландам і нямецкім дзяржавам, для ўмацавання свайго каралеўства. У Англіі Джэймс II праводзіў палітыку, якая ўспрымалася як абмежаванне пратэстантаў. У 1685 г. усё паказвала на тое, што аданаўляецца рэлігійная барацьба, ва ўсялякім выпадку на словах, калі не на справе. І вось з гэтага моманту крытыка хрысціянства стала больш вострай, больш рэзкай, зрэдку меней



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ананімнай, але заўсёды падазронай да ўлады царквы. Яна была адной з асноў крызіса, выкліканага манархічным абсалютызмам.

Аднак не толькі негатыўныя фактары прыводзілі да крытыкі хрысціянства. XVII стагоддзе стала эпохай даследаванняў у натурфіласофіі, але вучоныя тады і не думалі ні пра якія нападкі на хрысціянства. У 1543 г. Капернік выказаў думку, што з матэматычнага пункту гледжання больш правільным будзе паставіць у цэнтр сусвету Сонца. У 1610 г. Галілей накіраваў свой тэлескоп на Месяц і аб’явіў, што цені на яго паверхні – гэта горы. Новыя метафізічныя сцвярджэнні наконт прыроды спрычыніліся да рэлігійнага крызісу 1680-х гг., які выспяваў на працягу ўжо не менш як двух дзесяцігоддзяў.

Паступова, асабліва пасля 1685 г., адзін чалавек стаў увасабленнем зла для ананімных крытыкаў якраз тады, калі пачалася новая хваля праследаванняў пратэстантаў. Гэта быў Людовік XIV, які пад уздзеяннем сваёй новай фаварыткі-каталічкі раптам стаў вельмі набожным. З’явілася многа публікацый на французскай мове з фальшывымі выходнымі дадзенымі за межамі Францыі, якія перавозілі кантрабандай. А адзін выдавец быў проста пазначаны “***”.

Жан Л’Энжэню друкаваў кнігі, якія расказвалі пра каханне паміж святарамі і манашкамі, а таксама было многа літаратуры пра тое, што адбываецца пры французскім двары. У Галандыі друкавалі шмат антыіспанскай літаратуры, што цалкам зразумела. Магчыма, праблема была ў самой рэлігіі ці, правільней сказаць, у залішняй адданасці веры, калі людзі дакладна выконвалі догмы і верылі ўсяму, што гавораць святары. Залішняя вера вяла да фанатызму.

Пасля 1685 г. нападкі на французскага караля пачалі гучаць як пагроза, апазіцыйная прэса пісала, што адмена Нанцкага эдыкту будзе для яго пагібеллю. З гэтага моманту пачынае выкарыстоўвацца метафара “асветлены”, якая дасць назву перыяду Асветніцтва. Існавала думка, што пратэстанты цяпер павінны рабіць тое, што рабілі іудзеі. У барацьбе з абсалютызмам і французскім каралём вернікі выступалі адзіным фронтам. Пасля 1715 г., смерці Людовіка XIV, будзе няшмат такіх агульных прычын для аб’яднання.

У канцы XVII ст. падпольныя і ананімныя публікацыі сталі зброяй для барацьбы з цэнзурай і афіцыйнай уладай. Адказам на памкненні для многіх была ідэя рэспублікі. Яна ўяўлялася як свабоднае месца без праяваў разлажэння французскага двара. Набожнасць і апісанне годнасці грамадзян рэспублікі не перашкаджала ў тых жа выданнях дэталёва апісваць свавольствы каралёў і іх каханак [1, с. 185].

Неабходна таксама звярнуць увагу на складаныя адносіны паміж пратэстантызмам і крытыкай хрысціянства ў перыяд Асветніцтва. Вера ў разумнасць пратэстанцкай версіі хрысціянства падмацоўвалася несправядлівасцю праследавання пратэстантаў у 1680-х гг. Ад гэтага быў адзін крок да таго, што разумнасць – гэта ключ да дабрадзейнага жыцця. Асветніцкая крытыка хрысціянства ўзнікла ў пратэстанцкіх колах. Хоць многія каталікі таксама маглі крытыкаваць сваю царкву, менавіта пратэстанты былі ў авангардзе тых, хто падштурхнуў антыклерыкалізм да гетэрадоксіі (дэізм, атэізм, пантэізм).

У ананімным кёльнскім выданні тлумачыцца, што кальвіністы дзейнічаюць адказна, але ж таксама і сацыніяне, якія не прызнаюць боскую сутнасць Хрыста [2, с. 187]. Некаторыя пратэстанты, як Дж. Лок, застаючыся хрысціянамі,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

хацелі больш рацыянальнага хрысціянства. А яго сучаснік Дж. Толанд увогуле пакінуў хрысціянства. Толанд выкарыстаў тэрмін "пантэізм", які ён не тлумачыў, але даў зразумець, што ён не мае адносін да артадаксальнага хрысціянства.

У 1690-х гг. Лок апублікаваў трактат для падтрымкі хрысціянства "Разумнасць хрысціянства" (1695), у якім ён паспрабаваў выкласці самае асноўнае. На гэты твор Толанд адказаў яму пытаннем: чаму б проста не знайсці набор разумных прынцыпаў, заснаваных на законах прыроды? Толанд і Лок належалі да адной палітычнай партыі. Аднак Лока напалохала тое, што розум, падмацаваны новай навукай, можа так далёка завесці чалавека, асабліва калі ён не задаволены вышэйстаячымі.

У пратэстантызме гістарычна існавала напружанасць паміж рознымі групамі, а з канца XVII ст. узмацняецца страх перад абсалютызмам. Узнікала кансерватыўная пратэстанцкая версія Асветніцтва, у якой не было месца дэізму і непрыстойнасцям, улюбёным выдаўцамі. Але ўсе яе прадстаўнікі былі ліберальнымі ў дактрынальных пытаннях.

Ва ўспрыняцці пратэстантаў езуіты, схаласты і афіцыйныя цэрквы абыходзіліся з імі, як з яўрэямі [3, с. 270]. Пісьменнікі высмейвалі каталіцкае духавенства такім чынам, каб кнігі прадаваліся. Потым крытыкі задумаліся над пытаннем: можа быць, гэта больш сістэмная праблема, якая ляжыць глыбока ў еўрапейскай свядомасці?

Нараджаюцца сумненні наконт тэндэнцыі праследаваць іншых людзей, і якраз тады выходзіць многа літаратуры пра вандроўкі. Еўрапейцы адкрылі для сябе два новых свету: неба і іншыя кантыненты, пра якія расказвалі купцы і місіянеры. Параўнанні – часта з выдуманымі рысамі – прымушалі задумвацца пра ўласную сітуацыю. Утапічная літаратура пра падарожжы заўсёды заставалася сродкам крытыкі хрысціянскага духавенства, закаснелай дактрыны і нецалерантнасці.

Новая навука дала новае вызначэнне матэрыі, якая складаецца з атамаў і вымяраецца ў матэматычных тэрмінах. Уключыць Бога ў гэтую новую мадэль сусвету паспрабаваў Спіноза з яго пантэізмам. У многіх гэтыя погляды выклікалі трывогу. Аднак было і шмат новых прадстаўнікоў т. зв. радыкальнага Асветніцтва. Пачаўся гэты этап крытыкі з Вальтэра, а далей яго прадоўжылі больш радыкальныя філосафы. Галоўным вынікам такой бурнай разумовай дзейнасці было ўзнікненне ў пратэстанцкай Еўропе новай тэалогіі, якая чэрпала з натурфіласофіі, у прыватнасці ньютанаўскай фізікі.

Другая палова XVIII ст. характарызуецца секулярызацыяй. Хрысціянства страчвае свой бляск, духавенства было нізрынута з п'едэсталу і стала ўдзельнікам палітычных трансфармацый эпохі. А магчымасць думаць па-за межамі хрысціянскай дактрыны выйшла з радыкальнага Асветніцтва.

## Літаратура

1. Bussy, Roger de Rabutin. Amours Des Dames Illustres De Notre Siecle / R. de Rabutin Bussy. – Kessinger Publishing, 2009. – 608 p.

2. Le Jesuite Secularise (Ed. 1683) by J. Chastain. – Hachette Livre Bnf, 2013. – 194 p.

3. The Cambridge History of Christianity. – Cambridge University Press, 2008. – V. 7: Enlightenment, Reawakening and Revolution 1660 – 1815 / ed. by S. J. Brown and T. Tackett. – 2008. – 678 p.



Электронная библиотека МГУ имени А. А. Кулешова